# БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ГАЗЕТА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА

ГАЗЕТА ЎЗНАГАРОДЖАНА ГАНАРОВАЙ ГРАМАТАЙ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БССР

ЧАЦВЕР
5
СНЕЖНЯ
№ 30(1694)


НАЎЗДАГОН

## КОНКУРС ЗАВЕРШАНЫ

Памятаеце, мы паведамлялі вам аб конкурсе, прысвечаным 70-годдзю БДУ, на лепшую сумесную работу па фізіцы і матэматыцы супрацоўнікаў інстытутаў фізічнага і матэматычнага профілю АН Рэспублікі Беларусь, фізічных і матэматычных факультэтаў, інстытутаў прыкладных фізічных праблем і ядзерных праблем БДУ. Падведзены яго вынікі.

На конкурс былі прадстаўлены 9 работ.

Першая прэмія прысуджана калектыву аўтараў у складзе: Уладзімір Іванавіч КРЫЛОЎ, акадэмік АН Рэспублікі Беларусь (інстытут матэматыкі АН), Уладзімір Васільевіч БАБКОЎ, прафесар ФПМ БДУ, Пётр Ільіч МАНАСТЫРНЫ, прафесар ММФ БДУ — за манаграфію «Пачаткі тэорыі вылічальных метадаў» у 5-ці тамах, надрукаваную ў выдавецтве «Наука и техника».

Дзве другія прэміі прысуджаны калектывам аўтараў у складзе:

Рафаіл Фёдаравіч ГАБАСАЎ, загадчык кафедрай метадаў аптымальнага кіравання ФПМ БДУ, доктар фізіка-матэматычных навук, прафесар, заслужаны дзеяч навукі Беларусі, Фаіна Міхайлаўна КІРЫЛАВА, доктар фізіка-матэматычных навук, прафесар, загадчыца лабараторыяй тэорыі працэсаў кіравання ІМ АН РБ, Вольга Іванаўна КАСЦЮКОВА, доктар фізіка-матэматычных навук, старшы навуковы супрацоўнік лабараторыі тэорыі працэсаў кіравання ІМ АН РБ, Андрэй Уладзіміравіч ПАКАТАЕЎ, кандыдат фізіка-матэматычных навук, старшы навуковы супрацоўнік лабараторыі тэорыі працэсаў кіравання ІМ АН РБ — за цыкл работ па канструктыўных метадах і праграмнаму забеспячэнню экстрэмальных задач;

Казімір Серафімавіч АДЗЯРЫХА, Леанід Іванавіч КІСЯЛЕЎСКІ, Сяргей Барысавіч КАСЦЮКЕВІЧ, вучоны сакратар РНТЦ «Экалогія» АН РБ і ГК Рэспублікі Беларусь па экалогіі, кандыдат фізіка-матэматычных навук, Віктар Уладзіміравіч КРАСНАПРОШЫН, загадчык кафедрай МЗ АСК БДУ, кандыдат фізіка-матэматычных навук, дацэнт — за манаграфію «Фізічныя асновы дыстанцыйнага зандзіравання», выдадзеную ў выдавецтве «Універсітэцкае».

Дзве трэція прэміі вырашана прысудзіць калектывам аўтараў у складзе:

Уладзімір Віктаравіч КАБАНАЎ, кандыдат фізіка-матэматычных навук, старшы навуковы супрацоўнік лабараторыі аптычнай галаграфіі ІФ АН РБ, Аляксей Леанідавіч ТОЛСЦІК, кандыдат фізіка-матэматычных навук, в. а. дацэнта кафедры лазернай фізікі і спектраскапіі БДУ,

Альфрэд Васільевіч ЧАЛЕЙ, кандыдат фізіка-матэматычных навук, дацэнт кафедры лазернай фізікі і спектраскапіі БДУ — за цыкл работ «Дынамічныя галаграмы і чатыроххвалевае ОВФ у нелінейных асяроддзях»;

Уладзімір Сямёнавіч КУЗЬМІН, кандыдат фізіка-матэматычных навук, загадчык лабараторыяй ІФТТП АН РБ,

Іван Зянонавіч РУТКОЎСКІ, кандыдат фізіка-матэматычных навук, загадчык лабараторыяй НДІ ПФП БДУ, Аляксандр Пятровіч САЙКО, кандыдат фізіка-матэматычных навук, навуковы супрацоўнік ІФТТП АН РБ, Аляксандр Дзмітрыевіч ТАРАСЕВІЧ, старшы навуковы супрацоўнік НДІ ПФП БДУ, Рыгор Рыгоравіч ФЕДАРУК, кандыдат фізіка-матэматычных навук, старшы навуковы супрацоўнік НДІ ПФП БДУ — за цыкл работ «Рэха-спектраскапія двухузроўневых квантавых сістэм ва ўмовах нерэзананснага ўзрушэння неаднародна пашыраных ліній».

НАДОЕЧЫ

## РАТУЙЦЕ НАШЫ ДУШЫ!

З 26 да 28 лістапада ў Мінскім Палацы шахмат і шашак чытала лекцыі вучаніца індыйскага гуру Шры Чынмоя, урач з Югаславіі Стэла Шкрэблін, духоўнае імя якой — Джогатарыні. Яна прыязджала да нас з духоўнай місіяй, несумяшчальнай, па яе словах, з грашыма — таму лекцыі былі бясплатныя (рэдкі выпадак сёння). На трох лекцыях слухачы маглі судакрануцца з іррацыянальнасцю жыцця — Джогатарыні расказвала пра свайго ўлюбёнага Настаўніка, пра цуд яго дапамогі ў час смяротнай хваробы, пра жыццё гуру і яго вучняў, якія жывуць па ўсім свеце. Дарэчы, вучні Шры Чынмоя з'явіліся і ў Беларусі, дзе збіраюцца ўсе разам пасадзіць парк — як сімвал міратворчай місіі гэтых людзей.

Джогатарыні гаварыла, што паміраць не страшна, што жыццё — гэта шчасце, калі ў ім квітнее кветка кахання, вучыла беларусаў медытыраваць. Яна ўпэўнена, што медытацыя (засяроджанае сузіранне чалавекам сваіх запаветных глыбіняў, сваёй душы) робіць чалавека шчаслівым. Пасля лекцый анкетныя даныя новых кандыдатаў у вучні Шры Чынмоя будуць перададзены яму ў Нью-Йорк. Сама Джогатарыні 29 лістапада накіравалася ў падарожжа міру. Яна збіраецца зноў прыехаць у Мінск праз 3—4 месяцы.

## ЦІ БАЧЫЛІ ВЫ АТРЭСІНЫ?

29 лістапада на філфаку ўпершыню адбылося свята «атрэсін», адначасова са святкаваннем сямідзесяцігадовага юбілею факультэта, які з гэтай нагоды добра «трасянуў даўнінай».

Што такое загадкавыя «атрэсіны», распачаў тлумачыць сам дэкан у віншавальным выступленні. Гэта калі атрасаюць з сябе (ці яшчэ з кагосьці) нешта непрыемнае, напрыклад, ілжу ці пер'е з новага касцюма, і абавязковая ўласцівасць «атрэсін» — гэта іх лёгкасць і непрымусовасць.

Дык вось, свята было з размахам. Факультэту прыйшлося паварушыцца, каб сабраць пад сваім дахам знакамітых выпускнікоў, цяпер мэтраў культуры, сярод якіх былі Н. Гілевіч, І. Навуменка, В. Іпатава... Не лічачы тых, хто працаваў і вучыўся тут калісьці, зараз на філфаку 18 дактароў філалагічных навук, 17 прафесараў, 85 дацэнтаў, 58 выкладчыкаў, 20 лабарантаў і 1355 студэнтаў.

На працягу першай і афіцыйнай часткі свята на сцэну падымаліся дэкан факультэта А. А. Лойка, прарэктар універсітэта П. І. Брыгадзін, вядомыя пісьменнікі, афіцыйныя асобы і прыгожымі словамі віталі юбіляраў-філфакаўцаў.

З нагоды юбілею факультэту быў прэзентаваны каляровы тэлевізар з відэамагнітафонам, што выклікала відавочнае ўзрушэнне ў зале.

Пасля працяглай афіцыйнай часткі з кветкамі, калі прамоўцы раз-пораз «атрасаліся» ад папер, забыўшыся на іх, пакінуўшы недзе дома ў кішэнях, нарэшце быў зроблены антракт.

Другой часткай свята было пасвячэнне першакурснікаў.

## ЗАПАЛІЦЕ СВЕЧКУ

27 лістапада Беларускі Фонд Рэрыхаў правёў у Доме літаратараў вечарыну «Чалавек і яго духоўны храм».

Аказваецца, свята можа быць і такім — з ціхім патрэскваннем свечак у кандэлябры на сцэне, гукамі скрыпкі, трубы, флейты, са словамі старадаўняй малітвы. Багата было музыкі і спеваў, багата чыстых, нечуваных слоў — такія не гучаць на «штодзённым» нашым жыццёвым узроўні.

Пісьменнік Алесь Разанаў, які ўзначальвае Фонд Рэрыхаў, гаварыў горача, і нейкімі ўзнёслымі, балюча кранаючымі былі яго словы пра стук адвечных пытанняў у сэрца. Хто мы? Куды скіраваныя ў штодзённай мітусні?

Праваслаўны святар, пратаірэй Георгій Латушка выйшаў на сцэну ў мірскім касцюме. Гэта — толькі знешняя дэталь. Бо сутнасць захавалі словы пра тое, што дух чалавека — тварэнне Боскае. Удумайцеся — чалавек забыўся, што прызначэнне яго на зямлі быць адказным за прыроду, якой ён валодае, за душы другіх людзей. Не толькі клопат аб уласным выратаванні — але і дбанне пра астатніх. Тады толькі надыдзе сапраўднае ухоўнае адраджэнне.

На вечарыну прыйшоў глава духоўнага ўпраўлення мусульман Беларусі і Прыбалтыкі імам Муфтасі Алі Хазрэт. Імам быў у першай сваёй паездцы па рэспубліцы і (вось выпадак!) трапіў «з карабля на баль».

Дзіўна, але ў словах святароў не было супрацьлегласцей. Здаецца, яны гаварылі аб адным. Яны былі рады сустрэчы з людзьмі, якія здольны пачуць словы пра Вышэйшае.

Словы Бібліі і Дастаеўскага, айца Фларэнскага і Францыска Асійскага... Свята-пропаведзь праходзіла пад знакам Культуры. Чалавек, запалі свечку душы,— прагучаў заклік да здзяйснення нашай агульнай чалавечай місіі.



*Вам яшчэ не боязна азірацца навокал? Твары, калі не азлобленыя, дык засяроджаныя і сумныя. Паўсюдны дэфіцыт, дарагоўля — своеасаблівая прыкмета нашага часу. Таму нагода для расчаравання і дрэннага настрою існуе сама па сабе, без нашых намаганняў. А паспрабуйце адшукаць у натоўпе... звычайную ўсмешку, ад якой лягчэй на душы. Нашаму фотакарэспандэнту Алегу ГУСАКУ пашанцавала натрапіць на чалавека, які не страціў яшчэ здольнасці радавацца і першым халадам, і новай сустрэчы з сябрамі, і нават надыходзячай сесіі.*

*Дзівіцеся.*

*НА ЗДЫМКУ: студэнтка 3 курса аддзялення палітычнай гісторыі гістарычнага факультэта Вольга ТАЧЫЛІНА.*

## ВІНШУЕМ З ЮБІЛЕЕМ!

*Вучонаму сакратару навукова-даследчай часткі універсітэта* Генадзю Канстанцінавічу КУЗІЧАВУ — *70 год.*

*Віншуем з юбілеем і жадаем поспехаў, моцнага здароўя, шчасця!*

КУЛЬТ-СТУД-НЬЮС

## Таямніца спадарожнічае Рыхтару

Толькі што з канцэртамі наведаў Мінск усім вядомы музычны выканаўца Святаслаў РЫХТАР. Яго канцэрты праходзілі 30 лістапада. Між іншым, білетаў на канцэрт у продажу ніхто не бачыў. Білетныя касіры моўчкі паціскалі плячыма. Так што працэс здабывання запаветнай паперкі застаецца таямніцай.

## З грашыма ў бібліятэку

Ленінская бібліятэка, паслугамі якой мае ласку карыстацца не адно пакаленне студэнтаў, становіцца ўсё больш падобнай на «рассаднік культуры». Акрамя таго, што там (зразумела, не задарма) праходзяць выставы мастакоў ці ўласныя бібліятэчныя выставы кніг, скажам, па геральдыцы, пад дахам бібліятэкі можна набыць кнігі духоўнага зместу, якія выдаюцца як рознымі епархіямі нашай вялікай краіны, так і родным выдавецтвам «Універсітэцкае», а таксама рознымі грамадскімі аб'яднаннямі. Дык вось, ідучы за чарговай порцыяй ведаў, прыхапіце на ўсялякі выпадак кашалёк.

## ГУВЕРНЁР АЙЧЫННАГА ГАТУНКУ

Зусім нядаўна міжвузаўскі навучальны цэнтр «Эўрыка» прапанаваў студэнтам-аматарам авалодаць такімі пакуль што экзатычнымі і «найбольш прэстыжнымі як у СССР, так і за мяжой» прафесіямі, як манекеншчыца, фотамадэль, цырульнік і візажыст (спецыяліст па касметыцы), або зусім ужо гучная назва: масажыст шырокага профілю, або (неверагодна, але факт) — фермер і гувернёр.

Калі спецыялістам першых пяці прафесій работы, здаецца, хопіць, то што будуць рабіць у межах усё яшчэ савецкай рэчаіснасці загадкавыя фермер з гувернёрам — незразумела.

Акрамя таго, цэнтр збіраецца сціпла рыхтаваць бухгалтараў для ўсялякіх гасразліковых і арэндных прадпрыемстваў, кааператываў, бюджэтных арганізацый.

Цэнтр гарантуе сваім выхаванцам «высокую падрыхтоўку» (?!) і пасведчанне на дзвюх мовах.

## ШТО НОВАГА?

*Чарнобыльская бяда закранула мільёны людзей. І без іх свядомага ўдзелу яна не можа быць пераадолена. Аднак, калі шчыра, ці шмат інфармацыі атрымала наша грамадства пра канкрэтныя вынікі ўздзеяння радыеактыўнасці на чалавека?*

*Міжнародны вышэйшы Сахараўскі каледж па радыеэкалогіі, які адкрываецца ў сталіцы рэспублікі, ставіць мэтай сваёй дзейнасці ліквідаваць брэш у нашых агульных ведах. Рэктарам каледжа стаў кандыдат фізіка-матэматычных навук Аляксандр ЛЮЦКО.*

ДОШКА АБ'ЯЎ

## ДА ЎВАГІ ВАДЗІЦЕЛЯЎ!

*Згодна з Законам Рэспублікі Беларусь «Аб дарожным руху», з 1 студзеня 1992 года ўводзіцца ТАЛОН ПАПЯРЭДЖАННЯ да вадзіцельскага пасведчання.*

*Для атрымання талона трэба звярнуцца ў пакой № 211 корпуса ДАІ на праспекце Дзяржынскага, 3. Пры сабе мець: пашпарт, вадзіцельскае пасведчанне, медыцынскую даведку. Праверка правілаў дарожнага руху пры атрыманні талона праводзіцца не будзе.*

*Талон папярэджання, атрыманы раней, сапраўдны.*

*З 1 лютага будучага года асобы, якія не маюць талон папярэджання, будуць прыцягнуты да адміністрацыйнай адказнасці.*

*А. СЛЕСАРЭНКА,*
*начальнік ДАІ*
*Маскоўскага раёна.*

КАНФЕРЭНЦ-ЗАЛА

# «ДВА РАЗЫ Ў АДНУ РАКУ НЕ ЎВАЙСЦІ...»

*На факультэце журналістыкі адбылася чарговая прэс-канферэнцыя. На гэты раз субяседнікам студэнтаў-журналістаў стаў іх калега, былы рэдактар газеты «Знамя юности», намеснік рэдактара «Народной газеты»* Аляксандр Уладзіміравіч КЛАСКОЎСКІ. *Хоць прэс-канферэнцыя была вучэбнай, размова адбылася даволі цікавая. Прапануем чытачам некалькі пытанняў-адказаў, што прагучалі на ёй.*

**— Аляксандр Уладзіміравіч, Вы яшчэ даволі малады чалавек, але, нягледзячы на гэта, ужо былі рэдактарам часопіса «Парус», газеты «Знамя юности», а зараз займаеце пасаду намесніка рэдактара ў «Народной газете». Чым абумоўлены такі бліскучы ўзлёт, тым больш, што тыя часы, здаецца, не садзейнічалі росту талентаў?**

— Я добра разумею, што вы маеце на ўвазе. Не. Валасатай рукі ў мяне не было, калі я паступаў на журфак і калі пачынаў працаваць. Нарадзіўся ў вёсцы, і бацькі мае — звычайныя сяляне. Так што сувязяў у мяне не было. Затое была юнацкая мара — стаць журналістам. І я ім стаў. У студэнцкія гады пачаў актыўна супрацоўнічаць з прэсай і, відаць, зарэкамендаваў сябе няблага.

**— Адкуль у Вас з'явілася мара стаць менавіта журналістам?**

— Гэта адзін са спосабаў самавызначэння. На першым плане ў мяне была прага да слова. Таксама падабаўся сам працэс працы журналіста, калі з нейкай шурпатай загартоўкі, зусім сырога матэрыялу атрымліваецца сапраўдная рэч.

**— Скажыце, калі ласка, якія асноўныя прычыны нападаў з боку ЦК ЛКСМБ на «Знамя юности» і на Вас, у прыватнасці?**

— Гэта справа добра вядомая, але ў той жа час і вельмі цьмяная. ЦК ЛКСМБ нават не можа знайсці больш-менш аб'ектыўнай прычыны. На мой погляд, гэта звычайны працэс выбівання з абоймы непажаданых і непакорных, што распаўсюджана і да бляску арганізавана ў нас. Паміж поглядамі журналістаў і функцыянерамі, якія імкнуліся зрабіць «кішэнную» газету, узніклі шматлікія супярэчнасці. Маўляў, звузіўшы тэматыку, зрабіце камсамолу прывабны імідж. Ды не праходзіла гэтая справа ў апаратчыкаў: журналісты, якія ўжо ўдыхнулі паветра свабоды, не захацелі хадзіць пад апаратным сядлом і бізуном. Вынік — канфлікт. Мякка кажучы, мне прыйшлося пакінуць газету, як і многім іншым журналістам з саставу «Знамёнкі». І зараз калектыў рэдакцыі знаходзіцца пад ціскам камсамолу, працягвае змагацца і, на жаль, паступова развальваецца. І, вядома, гэта адбіваецца на якасці газеты. Яна стала, безумоўна, горшай, чым была раней.

**— Як Вы адчуваеце сябе ў крэсле намесніка рэдактара?**

— Калі мяне запрасілі ў «Народную газету», я не стаў прасіць пасаду. З задавальненнем працаваў бы звычайным аглядальнікам. Але Сярэдзіч пераканаў мяне ў неабходнасці такога кроку, дадаўшы, што размова не закончана. Я згадзіўся, хоць пасада намесніка не дазваляе разгарнуцца як журналісту. Я не імкнуся да кар'еры. Адчуваю, што ёсць яшчэ порах у парахаўніцах.

**— Вы, відаць, не будзеце аспрэчваць тое, што ў «Народной газете» сабраўся вельмі ўдалы калектыў, скажам, краса беларускай журналістыкі. Чаму ж тады газета не надта адрозніваецца сваім узроўнем ад іншых выданняў?**

— Не хачу пакрыўдзіць астатніх беларускіх журналістаў, але сапраўды калектыў у нас сабраўся добры. А вось наконт узроўню газеты я павінен сказаць, што ён абумоўлены некалькімі прычынамі. Галоўная — хвароба росту. Згадзіцеся, газета вельмі маладая. Не ўсё ўдасканалена належным чынам. Але будучыня ў газеты ёсць. Гэта пацвярджае сёлетняя падпісная кампанія, бо наклад узрос, а значыць, расце і цікавасць чытача да выдання.

**— Як Вы ставіцеся да з'явы двухмоўя ў «Народной газете»?**

— Лічу, што гэта заканамерная з'ява, бо рэальна ацэньваю стан беларускай мовы ў рэспубліцы. Не сакрэт, што поўны пераход газеты на беларускую мову зменшыць кола чытачоў. Гэта па-першае. А па-другое, пераходзіць на беларускую мову трэба паступова, каб пазбегнуць чарговай катастрофы, якіх у выніку неабдуманых рашэнняў у нашай краіне было і так шмат. Таму рэдакцыя пакідае на старонках газеты расейскую мову, але ў той жа час імкнецца павысіць працэнт беларускай мовы. Так што, двухмоўе — гэта цвярозы падыход да беларускай мовы і рэалістычная пазіцыя.

**— Уявіце, што заснавальнікам «Знамя юности» стаў працоўны калектыў, і Вас запрасілі назад. Вы пайшлі б?**

— Не. У адну раку двойчы ўвайсці нельга. Мне, скажам так, позна вяртацца на кругі свае. Я не парваў адносін са «Знаменем юности», але ўявіць сябе ў тым калектыве не магу. Зараз улíўся ў жыццё новай рэдакцыі, жыву яе клопатамі і турботамі, рваць усё ізноў проста не хачу. Лічу сваім грамадзянскім і журналісцкім абавязкам быць з «Народной газетой».

Запісаў **Ю. ЛЯШКЕВІЧ,**
**студэнт факультэта журналістыкі.**

ШЛЯХ ДА ХРАМА

*Бапцісты — само слова са школьных гадоў гучала для мяне пагражальна, атаясамлівалася з асобай ступенню жорсткасці, зла. Не глядзець тэлевізар, не наведваць тэатраў і дыскатэк, усё жыццё — за глухой агароджай, у цемры малітвеннага дома. Вось вобраз, які сфарміраваўся атэістычным выхаваннем і мастацкай літаратурай, што жыва апісвала амаль варварскія абрады братоў і сясцёр у Хрысце, страшэнныя кары, на якія асуджаліся вераадступнікі.*

*Які ж у сапраўднасці Бог гэтых людзей? З насцярожанасцю і нават баязлівасцю адчыняю дзверы Мінскай царквы евангельскіх хрысціян-баптыстаў (ЕХБ).*

# БОГ — ГЭТА ЛЮБОЎ

ТУТ няма звыклага для храмаў таямнічага прыцемка, мірыяд свячэй ля лікаў святых, ззяючага ўбрання. Светлая чыстая зала, роўныя шэрагі крэслаў, прэзідыум, кафедра. І толькі на пярэдняй сцяне над сцэнай адліваюцца золатам адлюстраванні крыжа, кнігі, чашы і дэвіз: «Бог — гэта любоў».

Бог — гэта любоў? І гэта ў бапцісцкай секце? Недаўменна разглядаю тых, хто сядзіць у зале. Твары ўрачыстыя і ўсхваляваныя, уся ўвага — да прэзідыума: ідзе сход.

Служыцелі царквы ў звычайных, мірскіх касцюмах. Адзін за адным падыходзяць яны да кафедры і тлумачаць главы і раздзелы Евангелля. Выступленні непрацяглыя, словы простыя, часам да прымітыўнага, але падкупляе і хвалюе эмацыянальнасць, за якой — глыбокая вера. Апавяданні аб жыцці Ісуса Хрыста, Яго вялікіх справах у імя выратавання свету і людзей, Яго высокай самаахвярнасці дзеля нас суправаджаюцца зваротамі да братоў і сясцёр праяўляць штодзённа цярпенне, вялікадушнасць, літасць. Ісус Хрыстос ніколі нікому не адказваў злом на зло, і ў гэтым — бязмежная сіла любові Яго. Без любві вы нічога не дасягнеце; пачніце любіць вашу сям'ю, усіх навокал, каб ажыццяўляць у зямным жыцці запавет Бога аб бліжнім — толькі такім чынам зможаце сэрцам прымаць Госпада. Бог ёсць любоў...

Як рэдка ў сённяшні суровы дзень гучаць такія звычайныя і неабходныя словы: паважайце, любіце, будзьце цярплівыя і літасцівыя.

Пасля сходу прэсвітэр Мінскай царквы ЕХБ Канстанцін Рыгоравіч ЛАМАКА ветліва згадзіўся расказаць пра сваю веру больш падрабязна.

— У нас у царкве, вы адразу гэта заўважылі, няма яскравага ўбрання і абразоў. Яшчэ ў Ветхім запавеце гучыць перасцярога: «не пакланяйцеся адлюстраванню рук чалавечых». Мы не маем дакладнага партрэта Сына Боскага Ісуса Хрыста, і, са слоў прарока Ісая, з драўляных і залатых багоў робім ідала. Гэта сапраўднае ідалапаклонства. А пакланяючыся Богу, мы павінны пакланяцца не дрэву і металу, а — Ісціне. У хрысціянскай веры таксама спачатку абразоў не было, узніклі яны недзе на мяжы VI стагоддзя; тады ж увялі кананізацыю (ЕХБ яе таксама не прымае, бо ступень святасці вызначаць нікому не дадзена, толькі Госпаду Богу). Няправільна, калі людзі прыходзяць у храм, каб паглядзець на прыгожыя роспісы, паназіраць за цікавымі абрадамі, малебнам. Гэтага недастаткова! Царква — не храм мастацтваў; без унутранай пашаны, без веры чалавек у царкве як экскурсант. Вера ў Бога — вось тое адзінае, што павінна вабіць нас у царкву; толькі тады мы



зможам служыць Богу чыстым сумленнем, сэрцам і душой нашай.

Сімвалы, што дапускае царква ЕХБ, пабудаваны строга на аснове пісання, яны існуюць у хрысціянстве здаўна. Крыж — увасабленне пакут, якія даравааны нам заўсёды, якія ўмацоўваюць дух цярплівых і праведных. Даючы настаўленне дванаццаці вучням Сваім, Ісус гаварыў: «І хто не бярэ крыжа свайго і ідзе ўслед за Мною, той не дастойны Мяне». Адлюстраванне чашы з вінаградам і цярноўнікам пастаянна напамінае аб пакутах і смерці Сына Боскага дзеля вызвалення ад грахоў чалавечага роду. А сімвал кнігі — сімвал вучэння; святое пісанне амаль цалкам жывое Слова Боскае, кіруючыся якім мы павінны будаваць сваё жыццё. Гэта вечныя ісціны, бо ніколі прарочае слова не ажыццяўлялася па волі чалавечай.

**— А ваш дэвіз «Бог — гэта любоў»?**

— Маецца на ўвазе найперш любоў Бога да чалавека, Яго тварэння. Любоў гэтая бязмежная, і каб выратаваць чалавечы род, Сын Боскі Ісус Хрыстос падвергся пакутам і здзекам, страшэннай смерці. І любіць Бога — значыць, з любоўю ставіцца адзін да аднаго, да ўсяго зямнога. «Если имею дар пророчества, и знаю все тайны, и имею всякое познание и всю веру, так что могу и горы переставлять, а не имею любви,— то я ничто... Любовь долготерпит, милосердствует, любовь не завидует, любовь не превозносится, не гордится, не бесчинствует, не ищет своего, не раздражается, не мыслит зла, не радуется неправде, а сорадуется истине; все покрывает, всему верит, всего надеется, все переносит. Достигайте любви, ревнуйте о дарах духовных...»

Зямля — часовы наш прытулак, душы ж наканавана жыццё вечнае. І дзеля яе выратавання чалавек павінен умець ахвяраваць сабой. Гэтак сама, як і ахвяраваць дзеля любві да іншых людзей. Жорсткасць, зло, злачынствы — вынік жыцця без веры, у забыцці душы. «Благословением праведных город возвышается, а устами нечестивых разрушается».

**— Аднак сёння наша грамадства звярнулася да святой веры, да царквы...**

— Але аснова нашага жыцця па-ранейшаму грахоўная. Сказана: не ствары куміра, бо прыйдзе анціхрыст, а мы і яму пакланімся. Бедны сёння народ, пустыя паліцы магазінаў, аднак многія людзі прасіць дапамогі пайшлі не да Бога, да калдуноў, экстрасенсаў і іншай сатанінскай сілы. Анціхрыст — гэта не кніжны герой, а рэальная асоба, якая нясе маральнае растленне і калечыць душу чалавечую. Лепш самы нявопытны ўрач, чым экстрасенс, бо апошні, калі лечыць цела, губіць душу. «Какая польза человеку, если приобретет он весь мир, а душу свою загубит».

**— Многія, асабліва моладзь, сталі цяпер часцяком наведваць царкву. Праўда, іх наведванні абмяжоўваюцца пастаўленай свячой...**

— Ніякім чынам гэта не асуджаю. Добра, што сталі прыходзіць. Аднак недастаткова пяць хвілін пабыць з Богам, за гэты час не зразумець яго Ісціны. І ад грахоў адной ці нават дзесяткам свечак не адкупіцца. Заўсёды лічыў і лічу: вера павінна быць асэнсаванай, і такой веры патрэбна вучыцца. Менавіта на сходах ЕХБ мы дапамагаем людзям зразумець Боскае Слова, высновы святога пісання.

**— А наколькі этычна звяртацца да Бога з просьбай дапамагчы ў здароўі, вучобе, шчасці?**

— Маліцца Богу ніколі не грэшна, хоць Гасподзь ведае патрэбы вашы раней за ваш зварот. «Просите, и дано будет вам... Ибо всякий просящий получает и идущий находит, и стучащемуся отворят. Есть ли между вами такой человек, который, когда сын его просит у него хлеба, подал бы ему камень?.. Тем более Отец ваш Небесный даст блага просящим у Него».

Кожны чалавек павінен даверыць душу сваю Богу і ўсяляк супрацьстаяць злой сіле. Мы не дасведчаны ў духоўнай сферы і не ведаем, як адбываецца барацьба за нашы душы, але менавіта сваёй любоўю павінны дапамагаць Богу весці барацьбу са злом.

**— У Вас уся сям'я ў ЕХБ?**

— Не. Жонка і трое дзяцей, а двое выбралі іншую сцежку. Мы нікога не заманьваем у ЕХБ ні хлуснёй, ні сілай. Прыходзяць па цвёрдай веры, перакананню. А самае жахлівае наша пакаранне — адлучыць вінаватага перад грамадой ад царквы. Мы робім усё, каб нашу веру прынялі свядома: ёсць нядзельная дзіцячая школа, для дарослых створана бібліятэка багаслоўскіх прац.

Баптыстаў, асабліва ў 30-я гады, жорстка праследавалі, гналі, скажалі сутнасць нашага веравучэння, намі палохалі людзей — і што? Наша грамадства стала больш культурным, больш багатым, больш прыгожым? Яшчэ зусім нядаўна ў аблвыканкаме ў мяне пыталі: «А вам не сорамна, што вы баптыст?» Я — верую, сумленне маё чыстае перад Богам, перад людзьмі, я заклікаю іншых да духоўнага ачышчэння, чалавекалюбства, цярпення, міласэрнасці...

**А. ЦЯРЭНЦЬЕВА.**

## КОСМАС побач з танцпляцоўкай

Размова пойдзе аб рытміцы чалавечага цела.

Адзін з самых магутных рытмічных стрыжняў чалавека — яго дыханне. (У многіх народаў словы «дыханне», «дух», «душа» аднаго кораню). Ад якасці дыхання залежыць наша жыццё, наша здароўе.

Дыханне лёгка ўпарадкоўваецца з дапамогай рытмічнага вымаўлення тэксту, хай сабе гэта заклінанне, баявы спеў ці проста рытмічныя выгукі. Упарадкаваныя рухі цела дапамагаюць падужэць чалавечай душы, у адзінстве танца мацуецца яна. Клопат пра душэўны стан бярэ на сябе рытуальнае мастацтва. Найбольш моцным сродкам для развіцця душы, яе якасцей была, на думку старажытных, музыка, асабліва спеў (паколькі душа і цела ў гэтым жыцці непарыўна звязаны, то танцавальная рытміка носіць такім чынам духоўны і нават сакральны — той, што належыць рэлігійнаму культу — абрадавы сэнс).

Танец мае ў сваёй аснове глыбокі духоўны сэнс. Кожны танец у старажытных увасабляе з'яднанне чалавека з магутнымі касмічнымі энергіямі. Музычнае мастацтва наогул трактуецца містычна аж да сярэднявечча. Вібрацыі, якія складаюць сутнасць музычных гукаў, па ўяўленню антычных мысліцеляў, у прыватнасці Піфагора, адыграўшага вялікую ролю ў развіцці антычнай музыкальнай тэорыі, — з'ява касмічная, планетарная. Вышыня тону (музычнага гуку) прапарцыянальная хуткасці свяціла, а суадносіны паміж танамі даюць гармонію сфер.

Раней танцавалі не ад залішняй сілы, а для яе набыцця, для аб'яднання энергій. Танцуючыя былі засяроджаны і напоўнены ўсведамленнем таго, што адбывалася. Танец быў не забавай, а часткай пастаянных зносін з касмічным светам, з прыродай і царствам духаў. Такой уяўляецца першабытная культура сучасным вучоным.

Рэшткі старажытных рытуальных карагодаў мы дагэтуль можам назіраць у звычайных дзіцячых навагодніх карагодах. Менавіта дзіцячыя гульні іншы раз захоўваюць даўнія магічныя абрады, трансфармаваныя ў гульні, толькі прадметам пакланення аказваецца не стод, а елка. Карані гэтага абраду губляюцца ў глыбокай старажытнасці, калі звычайна праводзілі рытуал ачышчэння напярэдадні новага года...

Дык што атрымала чалавечая культура танца ў спадчыну ад першабытнага і антычнага перыядаў? Першабытная духоўная і сакральная сутнасць танца служыла моцным сродкам аб'яднання ва ўсеагульным рытмічным руху з космасам. Першабытны экстаз прасвятляў і напітваў касмічнай энергіяй чалавека. Але з часам адбываецца пераход да раз'яднання рытуалаў і прыроды, да ўсведамлення сваёй уласначалавечай сутнасці і, як следства, да забыцця глыбіннага сэнсу танцавальных абрадаў. Пачынаюць вылучацца розныя групы танцаў, якія суадносна акцэнтуюць светлую, боскую іх прыроду і цёмную, ганебную як у грамадскім, так і ў асабістым жыцці. Аднак іх рытуальнасць усё яшчэ прагледжваецца, хоць і пачынае змяняцца. Усё часцей танцы ўспрымаюцца як сродак дасягнення вясёлага, радаснага настрою, як асалода і забава. І вось сёння вялікую ролю для правядзення моладзю вольнага часу адыгрывае музыка — самае духоўнае, самае містычнае, самае падсвядомае мастацтва. Сучасны танец, як ніколі, робіцца падобным на старажытны рытуальны, хаця і пазбаўлены яго непасрэднай ідэі — салідарнасці з космасам. Гэта ідэя захавана толькі ў нашай падсвядомасці, дзе засталася памяць пра тыя часы, калі ўсе людзі былі дзецьмі Зямлі і Космасу. Аднак сучасныя замежныя даследчыкі танца гавораць, што і ў наш час чалавек можа забыцца ў рытме на сваё «я», далучаючыся інтуітыўна да вялікага пульсавання Сусвету.

Т. ЦАРАГРАДСКАЯ.
Фота С. ГРЫЦА.



### ВІДАВОЧНАЕ-НЕВЕРАГОДНАЕ

## Вашы рукі — таямніца

*19 верасня (№ 21) мы з вамі пачалі гаворку аб хірамантыі. Тады высветлілі, якімі могуць быць тыпы рук у залежнасці ад колеру скуры, тэмпературы, сілы поціску, якія ўласцівы ўладальніку. А сёння паспрабуем прааналізаваць, які характар можа быць уласцівы чалавеку з пэўнай формай кісці і пальцаў.*

Адзін з асноўных тыпаў рукі — ЭЛЕМЕНТАРНАЯ. У сваім найбольш яскравым праяўленні яна сустракаецца далонь з непаваротлівымі, быццам прытупленымі кароткімі далонь і непаваротлівымі, быццам прытупленымі кароткімі пальцамі. Адагнуты крыху назад вялікі палец заканчваецца амаль ля асновы ўказальнага. Такія рукі сустракаюцца ў людзей, занятых грубай фізічнай працай і з'яўляюцца сведчаннем невысокага разумовага развіцця чалавека. У ім, як правіла, жывёльныя інстынкты пераважаюць, а таксама ўласціва лянівая фантазія пры сулівасці натуры. Не маючы цвёрдых маральных асноў, часта кіруюцца дагматычнай мараллю рэлігіі. Заўважана, што людзі з элементарнай рукой не маюць асаблівых патрабаванняў да жыцця, але, як толькі пазбаўляюцца падтрымкі, упадаюць у дэпрэсію і маюць патрэбу ў суцяшэнні.

Другі з асноўных тыпаў рукі — ЛАПАТАПАДОБНАЯ. Гэта шырокая, вялікая, таўстая кісць з лапатападобнымі пальцамі, канцы якіх шырэй за аснову. Уладальнік такой рукі, асабліва калі вялікі палец у яго моцна развіты, вызначаецца рашучасцю. Ён валодае практычным розумам, стараннасцю, імкненнем да дзейнасці, якая патрабуе пэўнага ўмення. Грубай фізічнай працы такі чалавек не прымае. Ён стараецца выбраць прафесію, якая не патрабуе вялікіх намаганняў. Рамеснік у ім падаўляе мастака. Да жыцця ў яго больш патрабаванняў, чым ва ўладальніка элементарнай рукі, пакланяецца ўсяму грандыёзнаму, унушальнаму. У каханні адрозніваецца вернасцю і пастаянствам, якое зыходзіць не з халоднасці натуры, а са звычкі і пачуцця доўгу. Лапатападобная рука з гладкімі пальцамі ўказвае на любоў да камфорту, вытанчанасці і бляску. Сярод уладальнікаў вялікай, масіўнай рукі, падобнай на лапату, сустракаецца мноства людзей з дзівацтвамі, неўтаймаваных у рэалізацыі сваіх ідэй і жаданняў.

АРТЫСТЫЧНАЯ, або КАНІЧНАЯ, рука — наступны тып. Яе вызначаюць канічна завостраныя пальцы з прадаўгаватымі (міндалепадобнымі) нагцямі. Гэта зусім не рука знакамітага артыста, але яе ўладальніку ўласціва натхненне. Калі такая рука кароткая і таўстая, а яе вялікі палец моцна развіты, гэта значыць, такі чалавек імкнецца да дабрабыту, шчасця і славы; акрамя таго, ён можа быць хітрым і здольным да складання розных праектаў. Гнуткая рука са слаба развітым вялікім пальцам характарызуе схільную да захаплення натуру, здольную ўспрымаць усё прыгожае. Уладальнік артыстычнай рукі не выносіць механічнай работы, манатоннай дзейнасці. У яго, як правіла, пачуццё пераважае над розумам. Ён не займаецца самааналізам ці глыбокімі разважаннямі, прымаючы жыццё такім, якое яно ёсць. На яго ўяўленне дзейнічае перш за ўсё форма, знешнасць, таму ён часта схільны меркаваць аб людзях па першаму ўражанню: па знешнасці, адзенню, абстаноўцы, у якой яны жывуць. Такі чалавек марыць аб свабодзе, любіць адпачынак, перамену месцаў, адчувае тугу, калі доўга знаходзіцца ў адных і тых жа абставінах. Ён пастаянна мае патрэбу ў новых знаёмствах, лёгка захапляецца, прычым нярэдка яго ўчынкі даволі эксцэнтрычныя. У каханні павярхоўны і непастаянны, наогул не здольны падпарадкоўвацца аднастайнаму ходу сямейнага жыцця, да таго ж, не маючы цвёрдых маральных асноў, неутаймаваны ва ўцехах. Словам, гэта натура, якая жыве толькі дзеля мастацтва і для задавальнення асабістых патрэб. Крайняя мяжа артыстычнай рукі вядома пад назвай «рукі ўцех», якія больш грубыя, чым артыстычная рука. Пальцы такой рукі таўстыя, ногці больш грубыя. Ва ўладальніка такога тыпу рукі са ўсіх рыс артыстычнай натуры прыкметна развіта страсць да ўцех. Наўрад ці вы зробіце памылку, калі дапусціце ў такога чалавека пачуццёвасць, самалюбства, ляноту, цынізм, эксцэнтрычнасць, марнатраўства, разумовую несамастойнасць, схільнасць да хлусні.

Наступны тып — ПРАКТЫЧНАЯ, ці ВУЗЛАВАТАЯ, рука. Такая рука звычайна бывае сярэдняй (калі не — хутчэй вялікай, а не маленькай) велічыні, з чатырохвугольнымі вузлаватымі пальцамі і моцна развітымі суставамі (фалангамі); далонь крыху ўвагнутая і даволі жорсткая. Гэта вельмі распаўсюджаны тып. Уладальнікам такой рукі ўласцівы тыя рысы характару, якіх не хапае чалавеку з артыстычнай рукой. Людзі з практычнымі рукамі схільныя да арганізацыйнай і рэгулюючай дзейнасці, адрозніваюцца вытрымкай, настойлівасцю, любоўю да парадку і павагай да правілаў прыстойнасці. Яны ўсё падпарадкоўваюць доўгу, розуму і не разумеюць, што значыць дзейнічаць пад уплывам пачуццяў. Іх моцнаму, энергічнаму духу не хапае размаху. Уладальнік такой рукі можа быць узорным, строгім і нават педантычным служачым, з яго атрымаецца ідэальны чыноўнік. Ён аддае перавагу рэальнаму перад ідэальным, напрыклад, розуму і таленту перад бліскучай знешнасцю, бо лічыць, што добрае важней чым прыгожае. Ён устанаўлівае сяброўскія адносіны толькі з адукаванымі і дысцыплінаванымі людзьмі, якія, па яго меркаванню, з'яўляюцца дасканаласцю. Чалавек з рукамі практычнага тыпу адрозніваецца вялікай акуратнасцю і наогул жыве, як добра наладжаны механізм. Прывілеі для яго каштоўней за неабмежаваную свабоду, ён заўсёды гатовы падпарадкоўвацца аўтарытэтам. Можна сказаць, што «вузлаватыя рукі правяць светам».

Да сустрэчы ў наступным спецвыпуску «Для цябе».

### ПАСПРАБУЙЦЕ!

## СВЯТА, якое мы робім самі

— Калі вы лічыце сябе майстрыцай з трывалым святочным меню;

— калі ад свята да свята сумуеце па катлетах, галубцах селядцах «пад футрай»;

я нічым не змагу дапамагчы вам, хіба што параіць: «Не марнуйце час! Не чытайце наступныя радкі! Не чытайце!!!»

Калі ж вы саромеецеся сваёй нявопытнасці, але гатовы эксперыментаваць хоць сто разоў запар, рыхтуючыся да прыходу гасцей, не страчвайце надзею. Чым вузей зацягвае кола сяброў дома пугаючая гонка рыначных цэн, чым агідней выскаляюцца пустыя паліцы, убачыўшы торбу ў вашых руках, тым шырэй нашы з вамі магчымасці праяўляць вынаходлівасць і здзіўляць.

Вас засмучае адсутнасць заліўной асетры на святочным стале? Замяніце яе... бутэрбродамі з чырвонай ікрой. Моркву, сялянскае масла, плаўленыя сыркі і селядец яшчэ можна знайсці ў нашых магазінах. Прапусціўшы ўсё разам праз мясарубку, вы атрымаеце не што іншае, як... чырвоную ікру. Застаецца толькі нарэзаць тонкімі лустачкамі батон.

МОЖАЦЕ ПАШЧЫРАВАЦЬ НАД ТАРЦІНКАМІ З КАПУСТАЙ І КАБАЧКАМІ.

Хлеб нарэжце тонкімі лустачкамі, абмакніце іх у яечна-малочную сумесь з цукрам, крыху падсмажце на масле з абодвух бакоў. Белакачанную капусту і кабачкі нарэжце і патушыце з малаком і маслам. Асобна патушыце нарэзаную моркву. Прыгатаваную гародніну перамяшайце з нарэзанымі яблыкамі, а таксама салатай і кропам. Масу палажыце на грэнкі, памажце маслам і запячыце. Падавайце, паліўшы смятанай.

Нязменны атрыбут беларускага святочнага стала — бульба. Вараная, смажаная, тушаная. Але я прызапасіла для вас іншыя варыянты:

БУЛЬБЯНЫЯ ПАЛАЧКІ. 300 грамаў бульбы абярыце і адварыце ў падсоленай адзе. 200 грамаў маргарына парубіце з 300 грамамі мукі, дадайце цёртую на дробнай тарцы ахаладжаную бульбу, два жаўткі і замясіце цеста. Вузкія валкі з яго выкладвайце на патэльню, змазвайце бялком і запякайце ў духоўцы 10—15 хвілін.

СВЯТОЧНАЯ БУЛЬБА. Абабраную бульбу варыце як звычайна, але ў канцы, выліўшы ваду, заліце бурачковы сок. Падавайце да стала, парэзаўшы на кружочкі, акрайчыкі якіх будуць чырвонымі.

Хутка Новы год — самы зручны час для эксперыментаў. І калі ў вас нешта не атрымаецца, успомніце выпадак, які здарыўся з маёй лепшай сяброўкай. Аднойчы да навагодняга стала яна прыгатавала гаршчэчак з... кашай. Думаеце, госці ўвесь год наракалі на яе густ і негасціннасць? Наадварот, бо сустракалі мы тады год Каня. Ва ўладаркі наступнага года — Малпы — свае ласункі. Скажам, ананасы. Гавораць, на смак іх сок ніколькі не адрозніваецца ад кампоту з кабачкоў. Паспрабуем?

Гаспадыня ЯНІНА.

### НАПАЎМІСТЫЧНА

## ПАГАВАРЫ СА МНОЮ, КАМЕНЬ

З навуковай тэорыі самаарганізаваных сістэм: «...дзве сістэмы, якія маюць некаторыя агульныя прынцыпы пабудовы, здольны ўзаемадзейнічаць паміж сабой». Астролагі лічаць магчымым узаемадзеянне паміж чалавекам і ювелірным камнем, які астралогіяй звязваецца з днём нараджэння. Апошнія навуковыя знаходкі даюць магчымасць прасачыць аналогію паміж такімі несуадноснымі на першы погляд аб'ектамі, як чалавек і камень, што нейкім чынам пацвярджае меркаванні астролагаў.

У камні мы знаходзім статычныя аналогіі дынамічных з'яў, якія адбываюцца ў так званым жывым арганізме. Ювелірныя камні (крышталі), як і жывыя істоты, належаць да класа самаарганізаваных сістэм, яны рэагуюць на праявы навакольнага асяроддзя, яны чуйныя да тэмпературы (камень турмалін, напрыклад, у гэтым выпадку выдзяляе зарады);

могуць «прастуджвацца» і хварэць (крышталі волава пры нізкай тэмпературы рассыпаюцца);

здольныя паглынаць энергію звонку і трансфармаваць яе (турмалін — цеплавую энергію ў электрычную, рубін — святло ў кагерэнтнае выпраменьванне), ёсць і іншыя здольнасці ў камянёў.

Дынамічныя працэсы таксама ўласцівы крышталям. Як і жывы арганізм, крышталь здольны расці, «харчавацца» і самаўзнаўляцца. Тэхніка росту крышталя падобна на ўзнаўленне дэзоксірыбануклеінавай кіслаты ў жывой клетцы (памятаем са школьнай біялогіі — гэта спіраль, якая сама дабудоўваецца). Як паказаў даследчык Ф. Франк, крышталь расце з раствора таксама па спіралі, быццам бы накручваецца сам на сябе, пасоўваецца ўперад і вышэй на адну і тую ж прыступку, нарошчваючы колькасць абаротаў у спіралі. Розніца паміж крышталем і клеткай арганізма — у тым, што ў крышталі рост і самазборка носяць колькасны характар, а ў жывой клетцы — якасны.

Пры жаданні ў ювелірнага камня можна знайсці аналогію з імуннай сістэмай арганізма ці ўласцівасць, аналагічную памяці. Такія паралелі небеспаспяхова праводзіў у сваёй кнізе «Містычныя ўласцівасці ювелірнага камня» Ф. К. Вялічка.

Астролагі, а таксама некаторыя філасофскія сістэмы Усходу, разглядаюць любую прыродную сістэму, здольную самаарганізоўвацца (такую, як камень ці чалавек) як своеасаблівы вібратар са сваёй частатой хістанняў. І калі частоты супадаюць, узнікае рэзананс, значыць, інфармацыйны і энергетычны абмен паміж чалавекам і камнем (аб гэтым аматары могуць прачытаць у сачыненнях Джэралама Кардана). І калі астролагі прапануюць вам быць добразычлівым да камня, які звязаны імі з вашым днём нараджэння, калі яны запрашаюць настроіцца на частату камня, то яны маюць на ўвазе ўстанаўленне такога рэзанансу, які раней адносілі да містычных праяў. Паколькі гэта гіпотэза яшчэ не ўвайшла ў падручнікі, лічыце, што перад вамі гіпатэтычны механізм узаемадзеяння двух палюсоў эвалюцыі: мінерала і чалавечага арганізма.

Н. ЖУК.
(Паводле кнігі
Ф. К. Вялічкі).


БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Цана 5 кап.

Мінская паліграфічная фабрыка «Чырвоная зорка» МВПА імя Я. Коласа.

5 снежня

Зак. 2081.

Т. 1000 экз.



220080, Мінск-80, УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК, ВУЛ. БАБРУЙСКАЯ, 9, ПАВЕРХ 4, ПАКОІ 74-75.
ТЭЛЕФОН 20-68-27.



Рэдактар
М. Г. ЗАГОРСКАЯ.